Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

Краўчанка Н.Г. *(в. Дзёрнавічы, Верхнядзвінскі р-н)*

ДЗЁРНАВІЦКІЯ ПАРТЫЗАНКІ

Вы трывожна сустракалі
век дваццаты, неспакойны,
Не схілялі ў час нашэсцяў непакорнай галавы.
Вам знаёмы кроў і порах,
партызанскія сцяжыны,
Помствы жар ў сэрцах добрых,
дзе б каханню гнёзды віць.
Вы на смерць ішлі без страху,
беларускія жанчыны,
У імя Радзімы светлай, міру, шчасця і любві!
Алесь Звонак

Жанчына жыве для таго, каб ствараць і захоўваць утульнасць у доме, гадаваць і выхоўваць дзяцей, клапаціцца аб блізкіх, сваёй цеплынёй і любоўю рабіць свет прыгожым і самой быць кветкай у гэтым свеце. Але, калі прыходзіць вайна, яна не дзеліць людзей на жанчын і мужчын, на старых і дзяцей. Вайна закранае ўсіх без выключэння. І мне здаецца, што асобае месца ў такі час адводзіцца менавіта жанчыне. Жанчыне, якая трымае ў руках вінтоўку, або ратуе жыцці ў шпіталях, жанчыне, якая чакае сына, брата, мужа, бацьку, або той, якая спрабуе выратаваць сваіх дзяцей ад іскраў вайны любой цаной. У такі складаны час жанчына перастае быць слабай. Яна становіцца моцнай, адважнай. Страшнае слова «вайна» і сёння выклікае смутак і боль. З вайной заўсёды асацыіруецца салдат-герой з аўтаматам, выратавальнік і абаронца дзяцей, жанчын і старых людзей. А колькі такіх герояў маюць жаночы твар. І колькі прыкладаў таго, што жанчыны ў такі складаны і трагічны час праяўлялі сябе не горш за мужчын. На вайне жанчыны служылі ўсюды: ад фронту да тылу.

Яркае пацвярджэнне таму – гісторыі лёсу жанчын, якія нарадзіліся і жылі да вайны ў вёсцы Дзёрнавічы Дрысенскага (Верхнядзвінскага) раёна, дзвюх былых сяброўак, настаўніц Вольгі Міхайлаўны Лявонавай і Зоі Аляксандраўны Бялько. Пра іх жыццёвы і баявы шлях я даведалася праз сустрэчы і гутаркі з самой Вольгай Міхайлаўнай, праз старонкі навукова-даследчых работ былых вучняў нашай школы Рамана Скачкова «Гісторыі роднага краю ў асобах» і Кацярыны Касач «Сейбіты разумнага, добрага, вечнага…», якія былі напісаны пад кіраўніцтвам настаўніц беларускай мовы і літаратуры Т.А. Аленінай і Л.А. Шчапяльковай. Гэтыя работы пра мужнасць, стойкасць і гераізм зямлячак, для якіх «у гады вайны не было пытання, з кім яны і супраць каго» [1, с. 3]. Лёс гэтых жанчын не можа не закрануць сэрца і пакінуць абыякавым нікога. Дзякуючы адданасці сваёй Радзіме, іх мужнасці, нянавісці да чужынцыў на роднай зямлі, яны змаглі выстаяць, выжыць і перамагчы. І ўзнікае такое ўражанне, што такіх людзей фашысты «маглі толькі забіць, але не здольныя былі ператварыць у рабоў» [2, с. 4].

На тэрыторыі раёна дзейнічалі І і ІІ Дрысенская, Асвейская брыгада імя М.Ф. Фрунзе, у якія ўваходзіла больш дзесяці партызанскіх атрадаў. Многія жыхары Дзёрнавіцкага сельсавета, у прыватнасці вёсак Дзёрнавічы, Бекачы, Верасенцы, Сядлоўцы, Залессе, Пярэкі, Казакова, Жукі, сталі партызанамі атрадаў імя Суворава, імя Кірава, 1-га і 2-га Калінінскіх атрадаў, якія ўваходзілі ў склад І і ІІ Дрысенскіх брыгад. Партызаны, мясцовыя жыхары, добра ведалі ўсе сцяжынкі ў лесе, падыходы да чыгункі, вузкія і мелкія месцы рэк Свольна і Дрыса. На іх ліку шмат дыверсій на дарогах і мастах, захоп палонных.

25 ліпеня 1942 года ў партызанскі атрад імя Суворава І Дрысенскай брыгады была залічана Вольга Міхайлаўна Лявонава. Да вайны яна скончыла Дзёрнавіцкую сярэднюю школу, вучылася ў Мінскім педінстытуце імя М. Горкага

на шасцімесячных курсах па падрыхтоўцы настаўнікаў рускай мовы і літаратуры для 5–7 класаў. У першыя дні вайны вярнулася дамоў, жыла, прыглядалася да падзей, гутарыла са сваімі сябрамі аб жыцці, рыхтавалася да барацьбы. А калі парторг сельсавета Мікалай Андрэевіч Бялей прапанаваў стать партызанкай, без ваганняў разам з аднавяскоўцамі ўступіла ў партызанскі атрад. Вольга Міхайлаўна ўспамінае: «Атрад размяшчаўся ў лесе недалёка ад вёсак Лешня, Рудня, Кабыльнікі (кіламетраў 12–15 ад Дзёрнавіч). Прыходзілася стаяць на пасту адной ноччу, сядзець у засадзе, хадзіць за харчаваннем у вёску – усё было рызыкоўна і страшна. Страшней за ўсё было трапіць жывымі ў рукі ворагу. А сілы і смеласці надавала пачуццё абавязку і страх быць высмеянай за палахлівасць і трусасць. Аднойчы прыйшоў загад узарваць чыгунку Полацк–Дрыса па лініі фронту. Ішла ўся брыгада. Выдалі ўсім толавыя шашкі, бікфордаў шнур, растлумачылі парадак дзеянняў. Галоўнае – хуткасць, масавасць, магутны агонь і з моцным крыкам ура бегчы на рэльсы. Адначасова сачыць за таварышамі: раптам патрэбна будзе дапамога. Ноч выдалася цёмная-цёмная. Падышлі да чыгункі, адкрылі агонь, бяжым, крычым. Раптам хтосьці схапіў мяне за плячо. Азірнулася – камандзір узвода Гірс Васіль. “Оля, гэта ты?!” – спытаўся і пабег далей. А назаўтра чую, як ён расказвае хлопцам: “Уяўляеце, і яна (гэта я значыць) бяжыць, страляе і крычыць «Ура!»”. А назад мне было бегчы ў шмат разоў цяжэй. Сілы амаль не было, толькі страх, што параняць і траплю ў рукі ворага. Але тут мне дапамог Кротаў Сцяпан. Трымаючыся за палу яго плашча, я дабегла за ім да сваіх.

Небяспечна і страшна было, калі наш атрад удзельнічаў у аперацыі па разгрому нямецкага гарнізона на чыгуначнай станцыі Свольна, калі пераходзілі зімой уброд раку Свольна ноччу пад абстрэлам, а на наступную ноч фарсіравалі раку Дрыса. Зіма выдалася марозная, але частыя абстрэлы нямецкай артылерыі ўзламалі лёд на рацэ Дрыса. Партызаны, каб пераправіцца на другі бераг, звязалі два бервяны дротам, утварыўшы пераправу. Бярвенне пакрывалася імгненна лёдам, людзі падалі ў раку. Знаёмая з дзяцінства рака ператварылася ў пекла. Вада ледзяная, ледзь не па горла, цёмная, а ззаду – немцы. Ды вось дзіва: на грып ці ангіну амаль не хварэлі. Былі іншыя хваробы: тыф, абмаражэнне і −

вялікая стомленасць. Шмат перажыта за гэты час. Шмат было і крыві нашай. А колькі страчана сяброў, баявых таварышаў! Вечарам размаўляеш, а раніцай чуеш, што яго ўжо няма, не вярнуўся з задання. Вось так, без дазволу забірала вайна маладосць і будучыню.

6 ліпеня 1944 года ў час нашага перамяшчэння наляцеў фашысцкі самалёт, пачаў бамбіць. У гэты дзень ранілі і мяне ў абедзве нагі. Ветрына, Полацк, Невель, Іванава. Тройчы быў прысуд ампутаваць мне нагу. Я адмаўлялася, бо не ўяўляла, як буду жыць калекай. Лепш смерць. Аднак амаль два гады па шпіталях далі свой вынік: ногі захаваліся, але і сёння ваенныя раны нагадваюць аб сабе.

19 чэрвеня 1945 года з незагоенай ранай я выпісалася інвалідам II групы. Сэрца напаўнялася радасцю ад сустрэчы з роднымі, сябрамі, аднапалчанамі. Нам, партызанам і воінам, марылася аб мірнай працы. І ніякія раны, ніякая інваліднасць не магла перашкодзіць займацца любімай справай. Я стала настаўніцай».

За баявыя заслугі, за стойкасць, мужнасць і адвагу Вольга Міхайлаўна ўзнагароджана двума ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, медалём «За баявыя заслугі» і шматлікімі юбілейнымі медалямі.

Ордэны Айчыннай вайны I і II ступені

Медалі Вольгі Міхайлаўны Лявонавай

Разам з Вольгай Міхайлаўнай у партызанскім атрадзе імя Суворава змагалася з ворагам і яе школьная сяброўка Зоя Бялько. У маі 1941 года Зоя скончыла першы курс Віцебскага педінстытута і збіралася ў родную вёску на канікулы, дзе яе з нецярплівасцю чакалі бабуля з дзядулем і сястра Зіна. Аднак вестка аб вайне змяніла вельмі многае, паламала ўсе планы. З першых дзён акупацыі дзяўчаты выконвалі розныя баявыя заданні: разведка, сувязь паміж партызанскімі атрадамі, здабыванне прадуктаў харчавання і медыкаментаў для партызан.

У снежні 1942 года ў мясцовых лясах фашысты пачалі карную экспедыцыю па знішчэнні партызан. Народныя мсціўцы, сярод якіх была і Зоя, атрымалі загад прабірацца за лінію фронту. Гэта быў цяжкі і небяспечны шлях, які забраў сотні жыццяў партызан і мясцовых жыхароў, якія рушылі ў дарогу разам са сваімі абаронцамі. Страху, пакут, голаду, холаду было шмат. Не раз партызанам прыходзілася ўступаць у бой з ворагам. Але дзяўчыне пашанцавала: з апухлымі ад

холаду і хадзьбы нагамі, стомленая, схуднелая, яна са сваімі сяброўкамі дайшла да лініі фронту і стала байцом Чырвонай Арміі, дзе са студзеня 1943 года служыла ў роце сувязістак да сакавіка 1945 года. На вайне як на вайне: усё вельмі страшна і небяспечна. Пры жыцці Зоя Аляксандраўна часта прыгадвала бой пад Дрэтунню – сапраўднае баявое хрышчэнне, дзе пад моцным агнём ворага ёй прыйшлося наладзіць тэлефонную сувязь. За гэты гераічны ўчынак Зоя Аляксандраўна Бялько была ўзнагароджана ордэнам Славы III ступені. Камандзір палка ўручыў узнагароду і пахваліў за мужнасць і адвагу ў баі.

«А было дужа страшна, снарады рваліся кругом, думала, што жывой не вярнуся, – успамінала Зоя Аляксандраўна. – А ў карэла-фінскай аперацыі прамым пападаннем снарада забіла ўсіх, хто ляжаў побач у акопе. А мне пашанцавала, за мяне хтосьці моцна маліўся». Потым удзельнічала ў фінскім прарыве, прымала ўдзел у вызваленні Ржэва, Вялікіх Лук, Тарту, дайшла да Польшчы. Радасную вестку аб перамозе сустрэла ў Данцыгу. Узнагароджана медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі», мела шмат юбілейных медалёў.



Награжден орденом Славы III степени № ордена 29643

Имеет право, начиная с апреля 1944 на получение орденских денежных выдач и на другие льготы и преимущества, согласно „Общего положения об орденах Союза ССР".

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР

№ 635778

ИЗВЛЕЧЕНИЯ

из „Общего положения об орденах Союза ССР" (утверждено постановлением ЦИК и СНК Союза ССР от 7 мая 1936 г.).

1. Орден Союза ССР является высшей наградой за особые заслуги в области социалистического строительства и обороны Союза ССР.

3. Орденами Союза ССР могут награждаться как отдельные граждане, так и войсковые соединения и воинские части Рабоче-Крестьянской Красной Армии, предприятия, учреждения и организации.

4. Награжденные орденом Союза ССР могут быть за новые заслуги повторно награждены тем же или другим орденом Союза ССР.

10. Награжденные орденом Союза ССР пользуются лично правом бесплатного про-

Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

ПОМНИТ СЕМЕЙНЫЙ АЛЬБОМ

В семейном фотоальбоме имеется фотокарточка Зои Белько, датированная маем 1941 года, снятая как раз после окончания первого курса Витебского пединститута. На снимке красивая ясноглазая девушка, у которой не по годам серьезный взгляд, говорящий о силе ее характера.

...Сдавая последний экзамен, Зоя уже была мыслями в родной деревне Дерновичи Верхнедвинского района. Там ее с нетерпением ждали бабушка с дедушкой и сестра. И вдруг тревожная, страшная весть — война.

С первых дней, как только немцы заняли территорию Беларуси, Зоя Белько в партизанском отряде имени Суворова. Тут же были и ее подруги-одноклассницы — Ольга и Мария. Девушки выполняли различные боевые задания: разведка, связь между партизанскими отрядами, добыча продовольствия и медикаментов для партизан.

В декабре 1942 года в верхнедвинских лесах началась немецкая карательная операция, направленная на уничтожение партизан. Климовский отряд, где служила Зоя Белько, получил команду пробираться через реку Дриса за линию фронта. Этот путь, унесший тысячи жизней партизан и мирного населения, Зоя Александровна сегодня без слез вспоминать не может. По ледяной, местами замерзшей реке, смогли перебраться немногие и им еще предстояло идти в полной тишине три дня по лесу возле немецких гарнизонов. Один детский вскрик мог погубить всех переходящих за линию фронта. Но Зое повезло, с опухшими от холода ногами она все ж таки добралась до своих частей. За службу в партизанах Зоя Александровна награждена медалью "За боевые заслуги".

Вышедших из окружения партизан распределили по частям. В январе 1943 года Зоя Белько была призвана в роту связисток.

Менялись части, дислокации войск, в которых служила молодая связистка. Настоящее боевое крещение Зоя получила в бою под Дретунью, где под перекрестным огнем противника она наладила телефонную связь. Вручая орден Славы III степени, командир полка оценил действия девушки и похвалил ее за мужество в бою.

Дороги войны: их не пересчитать. В карело-финской операции прямым попаданием снаряда убило всех рядом лежащих в окопе. Зоя чудом осталась жива. Потом она участвовала в финском прорыве. Получила здесь свою третью боевую награду: медаль "За отвагу". Принимала участие в освобождении Ржева, Великих Лук, Тарту. Попала в Польшу. Радостную весть о победе Зоя Александровна Белько встретила в Данциге. Вернулась после войны в родные места, где стала работать учительницей.

А. УСТИНОВА.

"ДЗВІНСКАЯ ПРАЎДА" № 7 (9372) 3

60

Её линия связи вела к Победе

Когда грянула Великая Отечественная война, Зоя Александровна Белько, уроженка деревни Дерновичи Верхнедвинского района, училась в Витебском педагогическом институте. Продвижение фашистских моторизованных частей было настолько стремительным, что учеба в пединституте оборвалась, и молодой девушке пришлось пешком добираться до родного дома.

Первая встреча с партизанами состоялась летом 1942 года. Командир отряда имени Суворова пригласил на собеседование несколько девушек. После небольшой подготовки им выдали оружие и отправили на боевое задание. Задача заключалась в следующем: у радистов, заброшенных в тыл врага, необходимо было регулярно брать сводки Информбюро о продвижении немецких войск на восток. С этой задачей девушки отлично справились. В очередной раз, сходив на боевое задание, Зоя Белько принесла приказ командиру отряда взорвать железную дорогу в направлении города Дриса. Так для отряда началась широко известная в истории "рельсовая война".

Боевых взрывных устройств не хватало. Партизаны наладили в лесу их производство, выплавляли тол из снарядов. Вместе с партизанами Зое не раз приходилось ходить на боевые задания к железнодорожному полотну, подкладывать взрывчатку и пускать под откос вражеские эшелоны. Больше всего ей запомнился взрыв моста через реку Дриса.

В декабре 1943 года немцы стали прочесывать полоцкие леса. Партизанам был отдан приказ влиться в ряды Красной Армии. Зима выдалась морозной, но постоянные обстрелы немецкой артиллерии взломали лед на реке Дриса, и партизанам пришлось по двум бревнам, связанным между собой проволокой, сооружать переправу. Одно неверное движение, и человек падал в ледяную воду. Кроме того, огонь вражеской артиллерии все усиливался. Зоя Александровна вспоминает, что переправа через реку, знакомую с детства, превратилась в ад. Погибло много боевых товарищей.

С января 1944 года партизанский отряд имени Суворова влился в боевые регулярные подразделения Красной Армии. Так как Зоя имела незаконченное высшее образование, ее сразу же определили в связь. Здесь требовались смышленные девушки и парни, которые могли найти выход из любой нештатной ситуации. И такая ситуация не заставила себя ждать.

Во время ожесточенного боя под Дретунью Зоя Александровна работала на коммутаторе. Обстрел был настолько массированным, что боевые части пехотинцев остались без связи. Взвалив на себя катушки с проводами, отважная девушка бросилась навстречу огню. Под свистом пуль и грохотом орудий Зое удалось устранить 23 порыва телефонного кабеля. Сама она говорит: "Я не верила, что останусь живой". Через два дня командир полка, узнав о подвиге девушки, представил ее к награждению орденом Славы III степени. В канун Международного женского дня 8 Марта эта награда была вручена.

А медаль «За отвагу» нашла Зою Александровну во время боев за Карелию. Сколько непроходимых болот пришлось преодолеть с катушками телефонных проводов за спиной! Злая судьба обошла стороной Зою, когда она одна тонула в болоте. Только сила воли и невероятное стремление к жизни помогли ей выжить и дойти до Победы, которую встретила в Германии. После войны, уже на пепелище, пришлось заново начинать мирную жизнь. Получить высшее образование Зоя Александровна так и не смогла. Жить было очень тяжело. Однако все-таки педагогическое училище по ускоренной программе она закончила, и в течение 41 года работала учительницей начальных классов в том же поселке Дерновичи.

Олег МЕШКОВ.

Артыкул з Верхнядзвінскай раённай газеты «Дзвінская праўда»

«Пасля вайны вярнулася ў родную вёску, працавала настаўніцай пачатковых класаў у Дзёрнавіцкай васьмігодцы і Страшнянскай пачатковай школе. Апошнія 20 год Зоя Аляксандраўна жыла ў Гарадку, памерла летам 2013 года».

Многае знікае, раствараецца бясследна, забываецца. А вось жыццёвыя і ваенныя дарогі гэтых дзвюх паважаных жанчын, настаўніц жывуць у памяці былых вучняў, настаўнікаў, аднавяскоўцаў. Давайце ж і мы, людзі XXI стагоддзя, не забываць пра нашых зямлячак, якія здзейснілі вялікі подзвіг дзеля нашага з вамі шчасця, маладосць якіх была абпалена вайною, але яны мужна змагаліся, выстаялі і прадоўжылі свой жыццёвы шлях, аддаючы нерастрачаную любоў дзецям, школе, людзям. Мы не можам і не маем права іх забываць.

Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

Награжден медалью:
„За Отвагу"

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР

Е № 927308

15 сентября 19[illegible] г.

ИЗВЛЕЧЕНИЯ

из „Положения о медали „За отвагу"

(Утверждено Указом Президиума Верховного Совета СССР от 17 октября 1938 г.).

1. Медалью **„За отвагу"** награждаются военнослужащие рядового, командного и начальствующего состава Рабоче-Крестьянской Красной Армии, Военно-Морского Флота и Войск пограничной охраны за личное мужество и отвагу в боях с врагами Советского Союза на театре военных действий, при защите неприкосновенности государственных границ или при борьбе с диверсантами, шпионами и прочими врагами Советского государства.

2. Награждение медалью производится Президиумом Верховного Совета СССР.

8. Награжденные медалью должны подавать личный пример храбрости, мужества и отваги в борьбе с врагами Советского государства и служить образцом для других граждан при исполнении государственных обязанностей.

5

МЕДАЛЬ ЖУКАВА

№ 0028181

Белько
Зоя
Александровна

УЗНАГАРОДЖАНЫ(А)

медалём ЖУКАВА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

М.П.

Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ
В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ
1941—1945 гг."

УДОСТОВЕРЕНИЕ

За участие в Великой Отечественной войне
Партизанка
Белько
Зоя Александровна
указом Президиума Верховного Совета СССР от 9 мая 1945 г.
награжден медалью
„За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг."
От имени Президиума Верховного Совета СССР медаль вручена
„13" мая 1946 г.
Председатель Витебского
(должность, воинское звание и подпись лица, вручившего медаль)
М. П.

УДОСТОВЕРЕНИЕ
Белько
Зоя
Александровна
за долголетний добросовестный труд от имени Президиума Верховного Совета СССР решением исполкома
Витебского
областного
Совета народных депутатов
от 6 июня 1978 г.
награжден медалью
„ВЕТЕРАН ТРУДА"
Секретарь исполкома
Витебского областного
Совета народных депутатов
М. П.
„13" июня 1978 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Адамовіч, А.** Хатынская аповесць / А. Адамовіч. − Мінск : Маст. літ., 1989. – 237 с.

2. **Адамовіч, А.** Я з вогненнай вёскі ... : [кніга-дакумент] / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 439 с.

3. **Памяць** : гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.]. – Мінск, 1999. – Кн. 1. – 528 с.

4. **Памяць** : гісторыка-дакументальная хроніка Верхнядзвінскага раёна : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.]. – Мінск, 1999. – Кн. 2. – 396 с.